джаны. Л. у Беларусі — прафес. арыентаваная ступень сярэдняй школы з тэрмінам навучання 2—4 гады. Забяспечвае атрыманне прафес.-тэхн. адукацыі. Частка іх існуе пры ВНУ (Л. БДУ, Л. Бел. нац. тэхн. ун-та і інш.) і арганізуе навучанне на старэйшай ступені сярэдняй школы (10—11 класы). У 2013/14 навуч. г. ў Беларусі дзейнічалі 28 ліцэяў.

**ЛІЧЫЛКІ,** вершаваны тэкст з дакладнай рытмічнай структурай; жанр *дзіцячага фальклору*. Выкарыстоўваюцца Л., каб выбраць аднаго ўдзельніка групы падчас гульні або інш. калект. дзейнасці. Вымаўляюць са скандзіраваннем і суправаджаюць пэўнымі рухамі: указаннем пальцам, палачкай ці інш. на кожнага з удзельнікаў па чарзе. Напр., Бег сабака// Ды праз мосцік,// Чатыры лапы,// Пяты хвосцік (в. Дворышчы Мінскага р-на); Раз, два, тры, чатыры,// Кошку грамаце вучылі:// Не чытаць, не пісаць,// А за мышкамі скакаць (в. Троіцкая Слабада Асіповіцкага р-на). У тэкстах Л. могуць сустракацца штучна ўтвораныя т.зв. таемныя словы. Яны не маюць нейкага пэўнага значэння, а толькі маркіруюць выканаўцу як удзельніка пэўнай узроставай групы. Напр.: Энікі, бэнікі// Елі варэнікі.// Энікі, бэнікі, клёц —// Выйшаў пузаты матрос (в. Тульгавічы Хойніцкага р-на); Аката, пáката, мэ,// Абель, дабель, дамінэ,// Ікі, пікі, ліка,// А ну-ка, выхадзі-ка (Мінск); Акаты, бакаты,// Цýкаты, бэ.// Áбэр, фабэр,// Куманэ,// Чы́кі, пы́кі, граматы́кі,// Іп, клін,// Выкінь камушак адзін (в. Кармок Асіповіцкага р-на). Тэкст Л. можа неістотна мяняцца ў залежнасці ад мясцовасці. Жанр знаходзіцца ў жывым бытаванні.

*Літ.*: Малыя жанры. Дзіцячы фальклор. Мінск, 2004. *М.Ю.Латышкевіч.*

**ЛІЧЫЦКАЯ КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА**, помнік рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Лічыцы Ваўкавыскага р-на. Пабудавана ў 2-й пал. 19 ст. з цэглы. Чатырохчасткавы храм падоўжна-восевай кампазіцыі: 2-ярусны (васьмярык на чацверыку) бабінец-званіца, трапезная, квадратны ў плане асн. аб'ём, 5-гранная апсіда з бакавымі рызніцай і ахвярнікам. Пакаты 4-схільны дах асн. аб'ёму завершаны цыбулепадобнай галоўкай на барабане, шацёр званіцы — яблыкам з крыжом. Фасады прарэзаны адзінарнымі і здвоенымі арачнымі аконнымі праёмамі ў кілепадобных ліштвах, крапаваны вуглавымі лапаткамі, апяразаны прафіляванымі карнізамі і аркатурнымі фрызамі. Царква дзейнічае.

**ЛІЧЭ́БНІК,** лексіка-граматычны клас самастойных слоў, якія абазначаюць адцягненыя лікі, колькасць,
парадак прадметаў пры лічэнні а
частку ад цэлага і выражак
тыя значэнні ў марфалагічны к
горыях роду, ліку, склону. Хар
рызуюцца здольнасцю спа
ў якасці колькаснага вызнача
ка выключна з назоўнікамі, з
Л. ўтвараюць сінтаксічна непадз
ныя словазлучэнні, што функ
януюць як адзіны член сказа.
значэнні і граматычных прык
тах вылучаюць Л. парадкавыя («ся
наццаты», «дзвесце другі») і колы
ныя (уласна-колькасныя: «пяц
«восемдзесят сем»; зборныя: «т
«шасцёра»; дробныя: «тры пят
«дзве трэція») і няпэўна-колька
(«трохі», «столькі», «шмат»). Пав
ле структуры адрозніваюць Л. пр
стыя («адзін», «пяць»), скла
(«шэсцьдзясят», «семдзесят») і са-
стаўныя («сорак тры», «адна трэц
«чатыры тысячы восем»). Гістары
Л. ўзыходзяць да інш. часцін мов
самі з'яўляюцца базай для ўтварэ
назоўнікаў, прыметнікаў, займен
каў, дзеясловаў, прыслоўяў і часціц з
дапамогай марфолага-сінтаксіч
лексіка-сінтаксічнага і марфа
нага спосабаў («паведаміў адзін зна-
ёмы», «па-другое», «патроіць»).

*Літ.*: Граматыка беларускай мов
Т. 1: Марфалогія. Мінск, 1962; Супрун
А.Е. Славянские числительные: стан
ление числительных как особой част
речи. Минск, 1969; Кароткая грамат
беларускай мовы. Ч. 1: Фаналогія. Мар-
фалогія. Марфаналогія. Мінск, 2007.
*Д.В.Дзя*

**ЛІШКАЎСКІ СЯДЗІ́БНА-ПА́РК
ВЫ КОМПЛЕКС**, помнік архіт
туры класіцызму ў в. Лішкі Бера
віцкага р-на. Закладзены ў 2-й пал.
19 ст. Належаў дэ Вірыёнам. Уключ
сядзібны дом, парк і гасп. пабудовы.
Сядзібны дом — каменны буды-
нак, расчлянёны на рознавысотн
аб'ёмы. Асн. аб'ём — 2-павярхо
да яго прымыкае аглядная вежа;
кавое крыло — аднапавярховае. Гал.
уваход вылучаны 2-калонным порці-
кам дарычнага ордара. У неглыбок і
плоскіх нішах размешчаны вокны. У



*Лічыцкая Крыжаўзвіжанская царква.*